Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
2 КРАСАВІКА 2019 г. АЎТОРАК № 61 (28928)



## Рэальныя перавагі Саюза

Дарагія беларусы і расіяне!

Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі сімвалізуе цвёрдую прыхільнасць нашых краін шматвяковай дружбе і агульным духоўным каштоўнасцям. Непадзельная спадчына мінулага, у якім былі Вялікая Перамога і стваральная праца некалькіх пакаленняў, абумовіла лёсавызначальнае рашэнне разам будаваць сваю будучыню.

Сёлета спаўняецца дваццаць гадоў з дня падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Гэты адносна невялікі гістарычны перыяд адзначаны важкімі дасягненнямі ў многіх галінах супрацоўніцтва, напоўнены неацэнным вопытам эфектыўнага вырашэння жыццёва важных задач.

Закладзеныя ў аснову нашага яднання прынцыпы ўзаемнага даверу і раўнапраўя дазваляюць праводзіць узгодненую знешнюю палітыку, паспяхова змагацца з сучаснымі выклікамі і пагрозамі. Саюзнае будаўніцтва забяспечвае захаванне агульнай гуманітарнай прасторы, паглыбленне ўсебаковых культурных сувязяў, падтрыманне цёплых чалавечых адносін.

Рэальныя перавагі Саюза сёння адчуваюць мільёны беларусаў і расіян. Паміж нашымі краінамі няма адчужанасці, ёсць свабода перамяшчэння і працаўладкавання, сацыяльныя гарантыі, роўны доступ да медыцынскіх паслуг і адукацыі.

Неабходна і далей пашыраць беларуска-расійскае супрацоўніцтва. Сур'ёзнаму росту глабальнай канкурэнцыі, узмацненню пратэкцыянізму і ізаляцыянізму мы павінны супрацьпаставіць сапраўдную інтэграцыю, рашучую ліквідацыю штучных бар'ераў і абмежаванняў у эканоміцы, рэалізацыю маштабных праектаў.

Перакананы, што разам нам гэта па сілах.

Дарагія сябры!

Прыміце сардэчныя віншаванні з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі і найлепшыя пажаданні добрага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Няхай у нашым брацкім Саюзе заўсёды пануюць мір, згода і ўзаемны давер!

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# АДНО ПОЛЕ НА ДВАІХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Іван і Святлана РУСІНСКІЯ з Полацка працуюць у філіяле «Вясна-энерга» Віцебскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскэнерга», якое знаходзіцца паблізу іх горада. Іван — трактарыстам-машыністам, Святлана — вядучым аграномам. Часта яны працуюць на адным полі, кожны выконвае сваю работу. Дарэчы, такой вясновай парой, на пачатку красавіка, адзінаццаць гадоў таму Іван і Святлана пабраліся шлюбам.

### КОРАТКА

• **Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.**

• Усяго з пачатку года на беларускім валютным рынку долар патаннеў на 1,45 %, еўра патаннеў на 3,42 %, а расійскі рубель падаражэў на 5,60 %.



• **Супрацоўнікі міліцыі будуць прымаць заявы грамадзян незалежна ад месца здарэння.**

Свая справа

## БУЛЬБА. Не толькі каштоўная культура

### Цікаўнасць аднаго чалавека дапамагла цэламу раёну стаць прывабным і самастойным

**З якімі цяжкасцямі сутыкаецца стваральнік фермерскай гаспадаркі, ці дапамагае дзяржава вяскоўцам і як пераманіць сталічных жыхароў на работу ў раён? Справа Уладзіміра АДАМОВІЧА *(на фота)* з Лагойска не толькі адказвае на гэтыя пытанні, але і стала ўзорам для іншых прыватнікаў.**



У гаспадарцы Уладзіміра Леанідавіча збіраюць рэкордныя 50—60 тон бульбы з гектара. Для кіраўніка гэты паказчык — не самы важны. «Выручка і прыбытак! Лічыць трэба грошы, а не ўраджайнасць ці валавыя паказчыкі», — упэўнены фермер.

Ён пачынаў з паспяховага фармацэўтычнага прадпрыемства, але ў 2011-м стала нецікава: «усіх вышынь дасягнуў», засумаваў і вырашыў пайсці новым шляхам. Пытання, чым жа заняцца, амаль не ўзнікла: яшчэ ў дзяцінстве, калі адпачываў у бабулі на канікулах, трохі зайздросціў паважанаму старшыні калгаса. А калі пасталеў, зразумеў, што зусім адарвацца ад глебы не атрымаецца. Вось і вырашыў даказаць (самому сабе, перш за ўсе), што з сельскай гаспадаркі можна жыць заможна.

Паўгода вывучаў, глядзеў, аналізаваў, наведваў гаспадаркі і спецыялізаваныя выстаўкі ў Беларусі і за мяжой — і заўважыў свабодную нішу. Амаль выпадкова: дапамагаў жонцы абіраць агародніну і запэцкаў рукі. «Чаму ў Еўропе прадаюць мытую бульбу, а мы — брудную?» — з гэтага пытання і пачаўся новы бізнес.

СТАР. 4

Ахова здароўя

## ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ

### Як працуе бальніца хуткай медыцынскай дапамогі

**Сталічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі — адна з тых медыцынскіх устаноў, якая кругласутачна аказвае экстранную дапамогу жыхарам двухмільённага горада. Інфаркты і інсульты, траўмы ў выніку ДТЗ, апёкі і атручэнні — у такіх цяжкіх станах вялікая імавернасць аказацца менавіта тут. Сёння ў 26 лячэбных аддзяленнях працуе 419 урачоў і 900 медсясцёр. Як функцыянуе самая вялікая бальніца ў сталіцы, якая, дарэчы, стане афіцыйнай клінікай II Еўрапейскіх гульняў, расказалі і паказалі журналістам.**

СТАР. 13




Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ISSN 1990 - 763X